# НА ШЛЯХУ ДА АЖЫЦЦЯЎЛЕННЯ “БЕЛАРУСКАГА НАЦЫЯНАЛЬНАГА ІДЭАЛУ”

***Куракевіч Н.І.***

*“Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі”, Мінск, Беларусь, kafgumd@bsuir.by*

Abstract. The article is focused on the main stages of formation and features of development of Belarusian national movement during the First World War. The article shows the conditions of struggle for national statehood, methods to achieve the goals and demonstration of patriotism in an effort to defend national interests. The publication contains a description of activities of political parties and individual leaders whose names we associate with the the results of struggle on the way to Belarusian national statehood.

Найбольш актуальнай тэмай у гісторыі Айчыны з’яўляецца праблема фарміравання беларускай нацыянальная дзяржаўнасці. У вырашэнні гэтай праблемы ў пачатку ХХ ст. велізарную ролю адыграў беларускі нацыянальны рух.

Беларускі нацыянальны рух значна ажывіўся, калі на акупіраванай Германіяй тэрыторыі былі адчынены беларускія школы, створаны выдавецтвы. Далейшай актывізацыі беларускага нацыянальнага руху спрыяла Лютаўская рэвалюцыя 1917 г. Актыўна прагрэсіравалі нацыянальныя беларускія партыі, якія прэтэндавалі на роль палітычнага цэнтра. Да лістапада налічвалася 14 нацыянальных партый розных накірункаў. Найбольш масавай партыяй была БСГ.

8-10 ліпеня 1917 года ў Мінску адбыўся II з’езд беларускіх нацыянальных арганізацый, які выказаўся за аб’яднанне ўсіх нацыянальных палітычных сіл вакол нацыянальнай ідэі – стварэння беларускай дзяржавы, але пакуль яшчэ ў межах дэмакратычнай федэратыўнай Расіі. Лютаўская буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя з’явілася пачаткам дэмакратычнага развіцця Расіі, у тым ліку і Беларусі, адкрыла шлях да эканамічнага і сацыяльнага прагрэсу краіны.

У канцы сакавіка ў Мінску адбыўся першы з’езд беларускіх нацыянальных арганізацый, на якім прысутнічала каля 150 дэлегатаў. Мэта з’езда – выпрацоўка ў новых умовах праграмы беларускага нацыянальнага руху. На чале барацьбы за развіццё рэвалюцыі стаяў рабочы клас. Ва ўмовах далейшага паглыблення агульнанацыянальнага крызісу барацьба народных мас супраць буржуазіі дасягнула небывалага размаху. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі на Беларусі, як і па ўсёй краіне, значна ўзмацнілася палярызацыя сіл. [3]

24 – 25 кастрычніка 1917 г. у Петраградзе перамагла сацыялістычная рэвалюцыя. Часовы ўрад быў скінуты. На II Усерасійскім з’ездзе ўлада ў горадзе перайшла ў рукі Савета. Перамога Кастрычніцкай рэвалюцыі і ўстанаўленне савецкай улады паклалі пачатак рэвалюцыйным пераўтварэнням ва ўсіх сферах грамадскага жыцця беларускага народа. Пад уплывам Кастрычніцкай рэвалюцыі беларускі нацыянальны рух падзяліўся на дзве асноўныя часткі.Адна падтрымлівала рэвалюцыю, другая выступала супраць яе.

Са змяненнем палітычных умоў паступова праходзіла пераарыентацыя ў беларускім нацыянальным руху. Ужо пасля Кастрычніка барацьба нацыянальных партый разгортвалася пад лозунгам “поўнага нацыянальнага самавызначэння”. Для ўстанаўлення ўлады, “выбранай самім народам беларускім”, ВБР абвясціла аб скліканні ў Мінску з’езда прадстаўнікоў усяго беларускага народа. У гісторыі беларускага народа Усебеларускі з’езд стаў важнай гістарычнай падзеяй.

Бачачы, што ў Беларусі пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва не пачыналася, і, асцерагаючыся, каб германскія, польскія, украінскія і літоўскія буржуазна-памешчыцкія сілы не паквапіліся на “безгаспадарчую” тэрыторыю



Библиотека БГУИР

Беларусі, беларускія нацыянальныя арганізацыі актыўна павялі лінію на ўтварэнне беларускай дзяржавы. Так на працягу аднаго месяца была сфарміравана дзяржава, стварэння якой дабівалася кіраўніцтва Беларускай сацыялістычнай грамады. [2]

Абвяшчэнне БНР з'явілася першай спробай рэалізацыі на практыцы беларускай ідэі, што ўзнікла яшчэ на пачатку XIX ст., сукупнасці ўсіх трох яе асноватворных элементаў – нацыянальнай свядомасці, нацыянальна-культурнага адраджэння і нацыянальнай дзяржаўнасці. Аднак гэта быў першы крок барацьбы за беларускую дзяржаўнасць. Незалежнасць і свабода, аб'яўленыя 25 сакавіка 1918 г., так і засталіся жаданнем і надзеяй.

Але пад уздзеяннем ЦК РКП(б) Наркомнац, а затым і Паўночна-Заходні абком РКП(б), Аблвыканкомзах, СНК Заходняй вобласці памянялі свае адносіны да лёсу Беларусі. Яны нават пайшлі далей у вызначэнні юрыдычнага статусу Беарусі, як Белнацком і беларускія камуністычныя секцыі, якія прытрымліваліся прынцыпу аўтаноміі Беларусі ў складзе РСФСР.

30 снежня 1918 г. на VI Паўночна-Заходняй абласной партыйнай канферэнцыі былі вызначаны этнаграфічныя межы беларускай нацыі, эканамічныя, гістарычныя і нацыянальныя асаблівасці асобных губерняў, паветаў і валасцей. У сувязі з абвяшчэннем БССР вышэйшая ўлада на тэрыторыі рэспублікі перайшла да Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада. І Усебеларускі з'езд Саветаў прыняў рашэнне аб аб'яднанні Беларускай ССР і Літоўскай ССР у адну дзяржаву – Літоўска-Беларускую ССР (Літбел). [1]

У першай палове лютага 1919 г. Польшча з дапамогай Антанты пачала ваенныя дзеянні супраць Савецкай Расіі. І першай ахвярай на шляху польскіх войск была Беларусь. Беларускі народ не схіліў галавы перад інтэрвентамі. Жорсткі акупацыйны рэжым і ўзброеная барацьба працоўных Беларусі супраць польскіх акупантаў аказалі значны ўплыў на тактыку беларускіх нацыянальна-дэмакратычных партый. На вызваленай тэрыторыі Беларусі пачалося аднаўленне савецкай улады. Беларускі нацыянальны рух у перыяд польскай акупацыі быў накіраваны на аб'яднанне ўсіх працоўных у іх барацьбе супраць інтэрвентаў і вызваленне Беларусі ад захопнікаў. Пачалася практычная работа па аднаўленні беларускай дзяржаўнасці. Вельмі складаным было тэрытарыяльнае пытанне адноўленай рэспублікі. Канкрэтна яе межы не былі вызначаны. І зрабіць гэта было вельмі цяжка. У лістападзе–снежні 1920 г. на Беларусі прайшлі выбары ў сельскія, валасныя, павятовыя і гарадскія Саветы. Рэўкомы былі скасаваны. У склад Саветаў увайшлі ў асноўным бальшавікі. Пры Саветах утварыліся камісіі, якія пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый праводзілі чыстку савецкіх устаноў ад "класава-варожых элементаў". 13–17 снежня 1920 г. адбыўся ІІ Усебеларускі з'езд Саветаў. З'езд абраў ЦВК БССР і звярнуўся да працоўных Беларусі з заклікам накіраваць усе сілы на аднаўленне народнай гаспадаркі рэспублікі.[3]

***Літаратура***


1. Шчаўлінскі М. Бежанцы і беларускі нацыянальны рух у гады Першай сусветнай вайны. //Беларускі гістарычны часопіс, 1999. - № 3. – С. 27, 28.
2. Ладысеў У. Ф., Брыгадзін П. І. Паміж Усходам і Захадам: Станаўленне дзяржаўнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі. – Мн.: БДУ, 2003. – С. 56-58.
3. Круталевич, В.А. На путях национального самоопределения (БНР–БССР–РБ)/. В.А.Круталевич. – Мн.: право и экономика, 1995. – С. 32.


Библиотека БГУИР